**Наша родная мова самая прыгожая і вельмі мілагучная. Яна - нібы спеў салаўя, нібы звон капелі ранняй вясной, нібы гук сярпа ў полі; яна цеплая, як матуліна пяшчота!**

**Беларускай мовай нельга не захапляцца, бо з дапамогай яе можна перадаць усю прыгажосць навакольнага свету, а таксама і ўнутраны свет чалавека. Калі родная мова папулярна і кахана, то таксама будзе і з народам, які на ёй размаўляе.**

**21 лютага** ва ўстанове прайшлі мерапрыемства

# «ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ».

На працягу дня выхаванцаў чакалі захапляльныя сюрпрызы. Дзеці з цікавасцю слухалі творы на беларускай мове, прымалі удзел у інсцэніроўках вядомых беларускіх казак.

Нікога не пакінула абыякавым выстава, прысвечаная Дню роднай мовы.

З вялікім натхненнем і азартам дзеці прымалі ўдзел ў беларускіх народных гульнях, з захапленнем даследвалі рэчы паўсядзённага побыту беларусаў.